Яшчэ адно значэньне слова хаваецца ў словазлучэньні „*вясковая крама*". Яна — адна з дамінантаў сельскага жыцьця. Празь ейны гарэлачны аддзел пралягаюць шляхі ў клюб, у сельсавет, да брыгадзіра, а то й да самога старшыні. Ля *крамы* чакаюць прывозу тавараў і абмяркоўваюць усё — ад сусьветнай палітыкі да маральнага аблічча аднавяскоўцаў.

*Крама* — месца нараджэньня савецкіх выразаў: ушла на базу, піва нет, прыём тавараў, пераўчот, па кілаграму ў адны рукі, отпуск па талонам. Хаця гэта ўжо й ня *крама*, а *магазын*.

# Красоўкі

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

Паводле народнай этымалёгіі слова *красоўкі* паходзіць ад краснага — прыгожага. Насамрэч назва *красоўкі* абавязаная сваім паходжаньнем *кросу* — спартоваму бегу ці гонцы па перасечанай мясцовасьці зь пераадоленьнем перашкодаў.

*Красоўкі* прыйшлі ў жыцьцё беларусаў на зьмену кедам недзе на пачатку 80-х. Як і кожная добрая рэч, у савецкія часы *красоўкі* адразу сталі дэфіцытам. Колькі *кросаў* прабегла моладзь у пошуках гэтага тавару, колькі стаптала старых *красовак*, каб набыць новыя! Дэфіцытнасьць *красовак* падвысіла іхны статус, і шчасьлівы ўладальнік абутку нават у страшным сьне ня мог сабе ўявіць, што гэтыя зручныя чаравікі трэба ўжываць на перасечанай мясцовасьці. У *красоўках* ішлі на дыскатэкі і ў рэстараны, у красоўках бралі шлюб, прыходзілі ў габінэты да высокага начальства, карацей — у *красоўках* жылі. *Красоўкі* сталіся паказчыкам заможнасьці: „У цябе *красачы* якой фірмы?"

Прывід свабоднага рынку ў Беларусі прынёс у прыватныя гандлёвыя кропкі процьму *красовак*. Цяпер дэфіцытам сталіся грошы, за якія гэтыя *красоўкі* можна набыць. Яны прыгожыя, трывалыя і зручныя. Шкада толькі, што ў адных *красоўках* цывілізаванага сьвету не дагоніш. Тут трэба і *красоўкі*, і да *красовак*.

# Краты

***Аляксандар Лукашук***

Краты — гіероглíф свабоды.

Прасьцейшы за *краты* толькі крыж. Ён зашыфраваны ў *кратах*, ці наадварот — *краты* зашыфраваныя ў крыжы.

*Краты* — адна з геніяльных вынаходак чалавецтва. Прырода ня ведае *кратаў*, як ня ведае кола. Гэта плён чыста чалавечага розуму. Разумнае жыцьцё на іншых плянэтах, напэўна, таксама немагчымае бяз *кратаў* — лёгкай і эканомнай канструкцыі, якая надзейна перакрывае прастору, ня дзелячы яе намёртва, як гэта робіць, напрыклад, сьцяна.

У *кратах* ёсьць намёк на свабоду — так бархатны пустыні нагадваюць марскія хвалі.

*Краты* ўражваюць ляканічнасьцю і выразнасьцю знаку: складзіце дзьве пары пальцаў наўскрыж — і ў Беларусі ў любым з 99 мінулых гадоў стагодзь-